© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

**УВАГА!** *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць.*

# ДРТ–2026 г.

## Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі

*Варыянт змяшчае* 38 *заданняў і складаецца з часткі* А (16 *заданняў) і часткі* В (22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

## Частка А

*У кожным заданні часткі* А *толькі адзін з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетачцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

**А1. Вера ў існаванне адзінага Бога – гэта:**

1) політэізм;
2) анімізм;
3) татэмізм;
4) манатэізм;
5) фетышызм.

**А2. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі адбылося ў:**

1) 476 г.;
2) 800 г.;
3) 843 г.;
4) 962 г.;
5) 1212 г.

**А3. Выкарыстоўваючы картасхему «Распаўсюджванне хрысціянства», вызначце правільнае сцверджанне адносна распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях у X–XII стст.**




1) Хрысціянскія мураваныя храмы былі пабудаваны ў гарадах Пінску і Тураве.
2) На тэрыторыі Беларусі былі заснаваны тры епархіі.
3) На тэрыторыі Беларусі першай з'явілася Тураўская епархія.
4) Хрысціянскія рэліквіі былі знойдзены ў гарадах Берасці і Браславе.
5) Горад Менск з'яўляўся цэнтрам епархіі.

**А4. Вызначце правільнае сцверджанне адносна духоўнага развіцця еўрапейскіх цывілізацый у Познім сярэднявеччы.**

1) Свецкая ўлада пап захоўвалася ў асноўным у Цэнтральнай Італіі.
2) У Заходняй Еўропе ў гэты перыяд праваслаўная царква была самай магутнай арганізацыяй.
3) Уплыў царквы на духоўнае жыццё грамадства ў XIV–XV стст. паступова ўзмацняўся.
4) У сярэдзіне XV ст. нямецкі вучоны Парацэльс вынайшаў друкарскі станок.
5) Важнай асаблівасцю еўрапейскай культуры гэтага перыяду з’яўлялася скарачэнне колькасці твораў, напісаных на нацыянальных мовах.

**А5. Гарадзельская унія паміж Вялікім Княствам Літоўскім (ВКЛ) і Польшчай была заключана ў:**

1) 1253 г.;
2) 1362 г.;
3) 1385 г.;
4) 1413 г.;
5) 1432 г.

**А6. Вызначце адзін з вынікаў Рэфармацыі ў ВКЛ:**

1) распаўсюджванне асветніцтва і дабрачыннасці ў грамадстве;
2) выгнанне арыян з краіны;
3) ліквідацыя свабоды веравызнання;
4) устанаўленне дамінавання каталіцкай царквы ў культурным жыцці;
5) паляпшэнне матэрыяльнага становішча праваслаўнай царквы.

**А7. Асноўным кірункам Контррэфармацыі ў Заходняй Еўропе была(-о):**

1) адмова ад удзелу ў рэлігійных войнах;
2) выданне Нанцкага эдыкта;
3) канчатковае афармленне англіканскай царквы;
4) падтрымка пратэстанцкага веравучэння;
5) стварэнне ордэна езуітаў і распаўсюджванне яго ўплыву.

**А8. У 1557 г. у ВКЛ быў (была) прыняты(-а):**

1) прывілей Казіміра;
2) Канстытуцыя;
3) «Устава на валокі»;
4) Судзебнік Казіміра;
5) прывілей Аляксандра.

**А9. Вынікі напалеонаўскіх войнаў былі падведзены ў 1815 г. на:**

1) Вашынгтонскай канферэнцыі;
2) Тэгеранскай канферэнцыі;
3) Венскім кангрэсе;
4) Парыжскай мірнай канферэнцыі;
5) Патсдамскай канферэнцыі.

**A10. Прамысловасць на беларускіх землях у XIX ст. спецыялізавалася пераважна на:**

1) перапрацоўцы нафты;
2) машынабудаванні;
3) вытворчасці ўгнаенняў;
4) вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі;
5) перапрацоўцы мясцовай сыравіны.

**A11. Аўтарам твора «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» з'яўляецца:**

1) Я. Колас;
2) Я. Баршчэўскі;
3) А. Пашкевіч (Цётка);
4) Ф. Багушэвіч;
5) Я. Купала.

**A12. Для сацыяльна-эканамічнага становішча Заходняй Беларусі (1921–1939) было(-а; -і) характэрна(-ы):**

1) пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці;
2) эксплуатацыя ляснога багацця Заходняй Беларусі польскімі і замежнымі кампаніямі;
3) больш высокія заработныя платы рабочых у параўнанні з цэнтральнымі раёнамі Польшчы;
4) стварэнне МТС (машынна-трактарных станцый);
5) правядзенне калектывізацыі.

**A13. Вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь пачаўся:**

1) 23 жніўня 1939 г.;
2) 1 верасня 1939 г.;
3) 17 верасня 1939 г.;
4) 30 кастрычніка 1939 г.;
5) 14 чэрвеня 1940 г.

**A14. П. М. Машэраў з'яўляўся першым сакратаром ЦК КПБ у:**

1) 1938–1947 гг.;
2) 1947–1950 гг.;
3) 1950–1956 гг.;
4) 1956–1965 гг.;
5) 1965–1980 гг.

**A15. Форма палітычнай барацьбы, накіраваная на змену ўлады ў дзяржавах пад прыкрыццём дэмакратычнай рыторыкі пры актыўным знешнім умяшанні, – гэта:**

1) гібрыдная вайна;
2) «каляровыя рэвалюцыі»;
3) сацыялістычная рэвалюцыя;
4) забастоўка;
5) інфармацыйная рэвалюцыя.

**A16. Дагавор аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі быў падпісаны ў:**

1) 1995 г.;
2) 1996 г.;
3) 1997 г.;
4) 1998 г.;
5) 1999 г.

## Частка В

*Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі* В, *запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетачцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, пазначаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

**В1. Устанавіце адпаведнасць.**

| Дата | Падзея на тэрыторыі Беларусі |
|---|---|
| А) 100 тыс. гадоў таму<br>Б) 40–35 тыс. гадоў таму<br>В) 24-е тыс. да н. э.<br>Г) 3-е тыс. да н. э. | 1) пераход ад палявання і збіральніцтва да жывёлагадоўлі і земляробства<br>2) пачатак бронзавага веку<br>3) пачатак каменнага веку<br>4) з'яўленне чалавека сучаснага тыпу (краманьёнца)<br>5) існаванне найбольш даўняй стаянкі першабытнага чалавека каля в. Юравічы |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**В2. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў X–XIII стст.**

1) Бітва на р. Нямізе;
2) пачатак княжання ў Менску (Мінску) Глеба Усяславіча;
3) хрышчэнне Старажытнай Русі;
4) выраб майстрам-ювелірам Лазарам Богшам шасціканцовага напрастольнага крыжа;
5) пачатак супрацьстаяння Полацкага княства і крыжакоў.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:*** **12345.**

**В3. Вызначце характэрныя рысы развіцця культуры беларускіх зямель у XI–XIII стст.:**

1) стварэнне рукапісных кніг;
2) будаўніцтва замкаў-кастэляў;
3) распаўсюджванне каменнага дойлідства;
4) распаўсюджванне пісьменнасці сярод насельніцтва;
5) замацаванне стылю барока ў архітэктуры.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**В4.** Пануючае становішча ў ВКЛ у XV–XVI стст. займала __________ **саслоўе**.

***Адказ запішыце словам у той форме, у якой яно павінна быць прыведзена ў сказе.***

**В5. Вызначце асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага развіцця цывілізацый у Познім сярэднявеччы:**

1) фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых манархій;
2) заняпад мануфактур у еўрапейскіх краінах;
3) уплыў знешняй пагрозы на аб’яднанне ўсходнеславянскіх зямель вакол Масквы;
4) заканадаўчае афармленне гарантаваных правоў падданых на валоданне зямлёй у краінах Усходу;
5) пачатак масавага вызвалення заходнееўрапейскіх сялян ад прыгоннай (асабістай) залежнасці.

*Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* **123.**

**В6.** Устойлівая супольнасць людзей, якая характарызуецца адзінствам паходжання, адзінай мовай, тэрыторыяй, эканамічным жыццём і культурай, псіхічным складам (характарам), этнічнай самасвядомасцю, – **гэта** __________.

*Адказ запішыце словам у той форме, у якой яно павінна быць прыведзена ў сказе.*

**В7. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў XI–XVIII стст.**

1) Падзенне Канстанцінопаля ў выніку турэцкай экспансіі;
2) заключэнне Люблінскай уніі паміж ВКЛ і Польшчай;
3) першы падзел Рэчы Паспалітай;
4) раскол хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную;
5) каранацыя літоўскага князя Міндоўга ў Новагародку (Навагрудку);

*Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* **12345.**

**В8. Вызначце характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага становішча беларускіх зямель у другой палове XVI – першай палове XVII ст.:**

1) зараджэнне мануфактурнай вытворчасці;
2) рост гарадоў і мястэчак;
3) увядзенне мяжы яўрэйскай аселасці;
4) узмацненне прыгоннага права;
5) правядзенне аграрнай рэформы.

*Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* **123.**

**В9. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Твор |
|---|---|
| **А)** Францыск Скарына | **1)** «Паходжанне відаў» |
| **Б)** Авіцэна | **2)** «Вялікае мастацтва артылерыі» |
| **В)** Чарльз Дарвін | **3)** «Вучэнне аб грамадстве» |
| **Г)** Казімір Семяновіч | **4)** «Малая падарожная кніжыца» |
| | **5)** «Канон лекарскай навукі» |

*Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* **А1Б4В3Г5.**

**B10. Вызначце характэрныя рысы развіцця культуры беларускіх зямель у эпоху Адраджэння:**

1) станаўленне прыгоннага тэатра;
2) распаўсюджванне архітэктурнага стылю рэнесанс;
3) распаўсюджванне кнігадрукавання;
4) фарміраванне беларускай школы іканапісу;
5) фарміраванне полацкай архітэктурнай школы.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**B11. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Падзея |
|---|---|
| **А)** Міндоўг<br>**Б)** Казімір Ягайлавіч<br>**В)** Антоній Тызенгаўз<br>**Г)** Вітаўт | **1)** стварэнне Судзебніка ў ВКЛ<br>**2)** заключэнне Крэўскай уніі ў 1385 г.<br>**3)** правядзенне рэформ у каралеўскіх эканоміях у Рэчы Паспалітай<br>**4)** утварэнне ВКЛ<br>**5)** ліквідацыя ўдзельных княстваў |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**

**B12. Прачытайце вытрымку з «Дэкларацыі французскага караля аб заснаванні Ост-Індскай кампаніі» (1664 г.).**

«Артыкул 37. Вышэйзгаданая кампанія можа дзейнічаць у межах ад мыса Добрай Надзеі да Магеланава праліва ва ўсіх Паўднёвых морах. Дазвол наш даецца кампаніі на 50 гадоў, прычым адлік часу пачынаецца з дня выхаду першых суднаў, падрыхтаваных кампаніяй, на Усход. Кампанія павінна займацца гандлем і навігацыяй у вышэйзгаданых водах, у той жа час абараняючы ўсякія французскія судны ў гэтым рэгіёне, для чаго ёй дазваляецца рэквізаваць або захопліваць патрэбныя ёй караблі, прыпасы, узбраенні, неабходныя для абароны нашага гандлю і нашых падданых».

**Выкарыстоўваючы вытрымку, вызначце правільныя сцверджанні.**

1) Кампанія абавязваецца абараняць усе судны ў згаданых водах.
2) У вытрымцы ўказваецца рэгіён, у якім дзейнічае кампанія.
3) У вытрымцы ўказваецца, што правасуддзе на тэрыторыях, якія кантралююцца кампаніяй, ажыццяўляецца прадстаўнікамі кампаніі.
4) У вытрымцы вызначана сфера дзейнасці кампаніі.
5) Кампаніі даецца дазвол тэрмінам на 60 гадоў.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 12.**

**B13. Укажыце дату *(год)* падзеі, якая адбылася *апошняй* сярод пералічаных:**

1) адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі;
2) адкрыццё першай чыгуначнай лініі на тэрыторыі Беларусі;
3) пачатак Вайны за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы;
4) узнікненне Беларускай рэвалюцыйнай грамады (БРГ);
5) абвяшчэнне Германскай імперыі.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* 1900.**

**B14.** У Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. абавязковы дакумент, які ўключаў апісанне памераў сялянскіх надзелаў і павіннасцей, – **гэта __________**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**B15. Вызначце наступствы прамысловай рэвалюцыі ў XIX ст.:**

1) зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва;
2) рост гарадскога насельніцтва;
3) замена машыннай працы ручной;
4) тэхналагічны прагрэс;
5) фарміраванне новых сацыяльных класаў.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**B16. Укажыце дату *(год)* падзеі, якая адбылася *першай* сярод пералічаных:**

1) заканчэнне Паўночнага паходу Нацыянальна-рэвалюцыйнай арміі на чале з Чан Кайшы і аб’яднанне Кітая пад уладай Гаміньдана;
2) утварэнне СССР;
3) падпісанне Дагавора аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй;
4) абвальнае падзенне курсу каштоўных папер на Нью-Ёркскай фондавай біржы;
5) прыход НСДАП да ўлады ў Германіі.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* 1900.**

**B17. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў 1917–1939 гг.**

1) Зацвярджэнне дыктатуры генерала Ф. Франка ў Іспаніі;
2) прыняцце рашэння аб правядзенні ў СССР калектывізацыі;
3) пачатак Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі;
4) абвяшчэнне Турцыі рэспублікай;
5) усталяванне рэжыму санацыі ў Польшчы.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* 12345.**

**B18.** План вайны Германіі супраць СССР, распрацаваны ваенна-палітычным кіраўніцтвам, атрымаў назву «__________».

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В19. У БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. пераважнае развіццё атрымалі галіны прамысловасці:**

1) дрэваапрацоўчая;
2) харчовая;
3) хімічная;
4) нафтахімічная;
5) прыборабудаўнічая.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В20. Вызначце асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця:**

1) арыентаванасць беларускай эканомікі толькі на расійскі рынак;
2) шматвектарнасць знешнеэканамічнай палітыкі;
3) дзяржаўнае рэгуляванне эканамічных працэсаў;
4) масавая прыватызацыя;
5) роўнасць розных форм уласнасці.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В21. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная падзея | Дата |
|---|---|
| **А)** стварэнне Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) | **1)** 1951 г. |
| **Б)** аварыя на Чарнобыльскай АЭС | **2)** 1957 г. |
| **В)** стварэнне Еўрапейскага эканамічнага супольніцтва (ЕЭС) | **3)** 1986 г. |
| **Г)** выбранне М. С. Гарбачова Прэзідэнтам СССР | **4)** 1990 г. |
| | **5)** 2001 г. |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**

**В22. Устанавіце паслядоўнасць падзей.**

1) Рэспубліка Беларусь стала краінай – партнёрам БРІКС;
2) правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму, адным з пытанняў якога было пытанне аб статусе рускай мовы;
3) стварэнне Еўразійскага Эканамічнага Саюза (ЕАЭС);
4) надзяленне Усебеларускага народнага сходу статусам канстытуцыйнага органа;
5) увядзенне ў эксплуатацыю першага блока Беларускай атамнай электрастанцыі.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* 12345.**